**Сусветная малітоўная кампанія ў гонар Беззаганнага Сэрца Марыі з мэтай выпрашэння Божага ўмяшальніцтва ў крызіс Касцёла**

Маці Божая ў Фаціме дала нам для нашага часу эфектыўныя духоўныя сродкі для атрымання асаблівых ласкаў ад Бога – Ружанцовую малітву і Набажэнства першых пяці суботаў.

Набажэнства першых пяці суботаў заключаецца ў наступным: у першую суботу пяці паслядоўных месяцаў прыступіць да сакрамэнту Споведзі і Святой Камуніі, памаліцца святы Ружанец і паразважаць на працягу пятнаццаці хвілін прынамсі над адной з пятнаццаці таямніц Ружанца ў інтэнцыі перапрашэння за грахі і знявагі супраць Беззаганнага Сэрца Марыі.

Перад абліччам велізарнага крызісу, які ахапіў зараз Каталіцкі Касцел, Братэрства Маці Божай Фацімскай пачынае сусветную духоўную кампанію, якая складаецца з штодзённай малітвы Святога Ружанца і практыкі пяці першых субот, каб праз Беззаганнае Сэрца Марыі выпрасіць Божую дапамогу і Яго ўмяшальніцтва, асабліва для Святога Пасаду ў Рыме.

Гэтая духоўная кампанія пачнецца ў першую суботу студзеня 2024 года (6 студзеня) і завершыцца ў першую суботу снежня 2024 года (7 снежня).

8 снежня 2023 г., Урачыстасць Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі.

Крыстофер П. Вендт, міжнародны дырэктар Братэрства Маці Божай Фацімскай.

+ Атаназій Шнайдер, духоўны асістэнт Братэрства Маці Божай Фацімскай, дапаможны біскуп Архідыяцэзіі Святой Марыі ў Астане